8. Рагаўцоў, В. І. Стандартныя адзінкі і іх роля ў стварэнні камічнага эфекту ў беларускай драматургіі / В. І. Рагаўцоў // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Гродна, 24 кастр. 2001 г. / Гродз. дзярж. ун-т ; пад рэд. У. І. Каялы, І. Я. Лепешава. – Гродна, 2001. – С. 90–95.
9. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В. Рагойша. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2001. – 384 с.
10. Слоўнік моладзевага слэнгу [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://anatolv.narod.ru/index/0-7. – Дата доступу: 10.08.2018.
11. Стилистический энциклопедический словарь русского языка ; под ред. М. Н. Кожиной ; редкол.: Е. А. Баженова, М. П. Котюрова, А. П. Сковородников. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Флинта : Наука, 2006. – 696 с.

Гоўзіч І. М. (Мінск, Беларусь)

ПАЭЗІЯ ЯНКІ СІПАКОВА І ЯЎГЕНА ЕЎТУШЭНКІ: МАСТАЦКІЯ ПАРАЛЕЛІ

Значнымі постацямі ў нацыянальным літаратурным працэсе другой паловы XX ст. з'яўляліся Янка Сіпакоў і Яўген Еўтушэнка, якія пайшлі іншым шляхам у адрозненне ад сваіх калег і сучаснікаў: выступілі найперш тонкімі лірыкамі, публіцыстамі, не былі дыдактычнымі настаўнікамі. Пэўная эвалюцыя ў мастацкім асэнсаванні рэчаіснасці паэтаў здарылася на прыканцы 1990-х гг., пра што сведчыць адыход ад яркага і нават «візуальнага» лірызму да філасафічнасці і медытатыўнасці.

Праграмным творам Я. Сіпакова з'яўляецца верш «Пра стол», які пераклікаецца з вершам Я. Еўтушэнкі «Пахнет засолами...». Мастакі не толькі ствараюць надзвычай яркія, каларытныя вобразы-карціны, але і прымушаюць працаваць нашы адчуванні: рэцыпіентам-чытачам здаецца, што ад старонак ідзе чароўны водар дзяцінства, зямлі, роднага дому. Аднак у канцы верша Я. Еўтушэнка выходзіць на абагульненне пра ідэю зменлівасці чалавечага жыцця і характару («...я не знаю ничего ничегошеньки...» [1, с. 41]), а наш зямляк раскрывае незвычайнасць бытавых рэалій, адметнасць светаўспрымання, нацыянальнай ментальнасці і характару праз апісанне стала з вячэрай: «Марозікам пахне капуста, / Жаўруковаю песняю яблык, / Вераснем – сопкая бульба, / Расой – агурок крамяны. / А стол пахне добрай вячэрай» [2, с. 26].

Гэты верш Я. Сіпакова, па вызначэнню крытыкаў, з'яўляецца лепшым у яго ранняй творчасці. Як адзначаў у адным з крытычных артыкулаў М. Стральцоў, у ім можна ўбачыць удалае «пашырэнне сэнсавых і тэрытарыяльных сфер вобраза» [3, с. 175], паэт здолеў адчуць сябе маленькай часцінкай прыроды, сусвету, космасу, якая знаходзіцца ў непарыўнай еднасці і гармоніі з наваколлем, у няспынным абнаўленні, колазвароце.

Ужо ў названых вершах назіраецца выразнае адрозненне творчасці Я. Сіпакова і Я. Еўтушэнкі ад паэзіі іх сучаснікаў: зварот да традыцыйнага фальклору, да яго рытмамелодыкі: даволі часта ствараецца ўражанне, што іх вершы спіраўды народныя, песенныя, з багатай славянскай вобразнасцю, насычаныя мелодыкай, рыфмоўкай.

У наступных зборніках Я. Сіпакоў і Я. Еўтушэнка здолелі перайсці ад простай назіральнасці за рэчаіснасцю да глыбокага асэнсавання пэўных праяў, знайсці заканамернасці ў выпадковым, у звычайным – узвышанае, боскае, у штодзённасці – свята, радасць. Тут выявілася арыгінальная стылёвая манера паэтаў: канкрэтызацыя ў кнігах дасягнула высокай ступені, дзякуючы якой і «зрокавасці» (візаўльнасці) пісьма адбыўся сінтэз прыватнага і агульнага, мінулага і сённяшняга, факты загаварылі самі за сябе, атрымалі высокі, абагульнены сэнс. Знойдзеныя паэтамі прынцыпы пісьма давалі ім магчымасць пераадолець традыцыйныя штампы і тэматыку бацькоўскага дому, дзяцінства, апаленага вайной.

Паступова абодва паэты ўсё больш звяртаюцца да гістарычнай тэматыкі, да адлюстравання эпохі НТР, паказу сувязі і еднасці часоў і пакаленняў. Падобныя абставіны выкліканыя не толькі пасталеннем мастакоў слова, далейшым развіццём іх таленту, але і зменамі ў свядомасці і грамадскім жыцці пад уплывам хрушчоўскай адлігі. Шырокі, «ушчыльнены» час увайшоў у іх зборнікі не проста вершамі, фрагментамі, а цэлымі цыкламі, якія маюць асобныя назвы і з'яўляюцца ўдалымі спробамі асэнсавання гісторыі ад самага яе пачатку. Беларускі паэт змог раскрыць імгненні жыцця і рух падзей праз яскравую і вобразную мастацкую дэталь, а «сёння» – як непарушнае звяно ў ланцугу сусветнага быцця. Параўнаем вершы Я. Еўтушэнкі «Мёртвая рука» і Я. Сіпакова «Абнаўлення, хлопцы, абнаўлення…»: «Мертвая рука прошлого, / крепко ты еще вцепилась в нас. / Мертвая рука прошлого / ничего без боя не отдаст» [1, с. 55].

Пры дапамозе мастацкага вобраза «мёртвая рука», якая трымае не толькі паэта, але і ўсе пакаленні, паказваецца дзень сённяшні як важкі момант ва ўсёй гісторыі чалавецтва, сувязь часоў і пакаленняў, асобных лёсаў і лёсаў народаў, прычым трагічных, апаленых войнамі, скалечаных таталітарызмам. Я. Сіпакоў заклікае чытачоў да абнаўлення душ, змывання з іх бруду, вяртання да сваіх эмацыянальна-маральных вытокаў (дзяцінства): «Абнаўлення, хлопцы, абнаўлення / Прагнем, нібы ліўня ў цішы. / Абнаўленне – гэта ўжо наўленне / У дарозе стомленай душы» [2, с. 137].

Як відаць з гэтых твораў, стройнасць вобразнай сістэмы, адзінства і цэласнасць аўтарскай думкі, аб'яднанай вялікім пачуццём, – яшчэ адна рыса, уласцівая творчасці Я. Сіпакова і Я. Еўтушэнкі, а менавіта таму душа лірычных герояў востра рэагуе на няўдачы. Вершы, прысвечаныя зменам, якія адбываюцца ў грамадстве, напоўнены значным філасофскім зместам, што пацвярджае наш тэзіс аб прыналежнасці Я. Сіпакова (у большай ступені) і Я. Еўтушэнкі (у меншай) да ліку паэтаў-філосафаў, якія знаходзяцца ў стане пошуку, заглыблення ў рэчаіснасць.

Прастора і час у медытатыўнай лірыцы паэтаў часцей за ўсё нестабільныя: першая то звужаецца, то пашыраецца, другі то фіксуецца ў кропку, то выплёскваецца ў Космас, а таму нагадвае мастацкую мадэль свету, заснаваную на пастаноўцы складаных і дыялектычных пытанняў пра Дабро і Зло ў планетарных маштабах у цэнтр меркаванняў і лірычных роздумаў.

Адрозненне філасофскай лірыкі Я. Сіпакова і Я. Еўтушэнкі заключаецца ў спосабе падачы матэрыялу, у жанрава-пафасным яе вар'іраванні: вершы беларускага паэта больш элегічныя, насычаныя шматлікімі метафарамі, эпітэтамі, перыфразамі, мастацкімі дэталямі, вобразамі-сімваламі, заснаваныя на адзінстве думкі і пачуцця пры раскрыцці значных праблем, стыль жа рускага паэта больш «графічны», менш насычаны тропамі. Адзінства ж лірыкі абодвух паэтаў заключаецца ў паяднанні традыцый класічнай паэтыкі і фальклору і ў актыўным пошуку новых жанравых форм і сродкаў мастацкай выразнасці. Я. Сіпакоў у большай ступені і Я. Еўтушэнка ў меншай ствараюць творы з адзнакамі яркай метафарычнасці, заснаванай на канкрэтных, а не абстрактных паэтычных назіраннях, паказваюць сувязь чалавека з прыродай, навакольным асяроддзем, «зямную першароднасць», калі так можна сказаць, раскрываюць унутраны стан чалавека, які карэннем звязаны з роднай зямлёй, з народам, адухоўленым светам. У Я. Сіпакова і Я. Еўтушэнкі паступова выпрацоўваецца ўзаемазвязаная і ўзаемаабумоўленая градацыя паняццяў «думка» – «слова» – «вобраз», пры вызначальнай ролі першага, але толькі слова – выява глыбокай думкі – можа стаць яркім мастацкім вобразам. Абодва паэты насычаюць свае творы не толькі разнастайнымі «рэчыўнымі» вобразамі і яскравымі выяўленчымі сродкамі, але і такімі шматзначнымі вобразамі-сімваламі, як Дабрыня, Час. Аднак, у адрозненне ад «урбаністычна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

га» паэта Я. Еўтушэнкі, Я. Сіпакоў па-язычніцку смялей і ярчэй паяднаўваў чалавечы пачатак з прыродным. Любоў да прыроды перарастае ў яго твораў у сапраўдную сакралізацыю яе як усеагульнай першакрыніцы жыцця, прыгажосці. Таму адухаўленне неадухоўленага (рэчаў, з'яў прыроды), антрапамарфізм становяцца асновай лірыкі Я. Сіпакова («Лес прачынаецца», «Хмара», «Сонца села», «Заходзіць аблык», «Кроплі сонца», «Пушчу турбуе клопат адзін») і не атрымліваюць вялікага распаўсюджання ў Я. Еўтушэнкі.

Я. Сіпакоў і Я. Еўтушэнка – асобы, закранутыя вайной, вершы ваеннай тэматыкі атрымалі ў іх творчасці не толькі выразнае адчуванне гучанне, высокую пафаснасць, але і адрозніваюцца трагедыйнасцю, што ўзнікае праз антытэзу ваеннага і мірнага жыцця, праз адмаўленне аднаго і ўхвалення другога («Перамога» Я. Сіпакова і «Свадьба» Я. Еўтушэнкі). У творах, прысвечаных вайне, аўтары не толькі «фатаграфуюць» пэўныя падзеі, але і глыбока разважаюць пра лёс асобнага чалавека і грамадства ў цэлым, пра нечалавечую жорсткасць і знішчэнне дабрыні. Гэта часцей за ўсё палымяныя паэтычныя звароты да людзей, каб яны памяталі свае першавытокі і захоўвалі чалавечы воблік нават у парадаксальных сітуацыях.

У пазнейшай творчасці паэты звяртаюцца да паказу руху гісторыі. Я. Сіпакоў і тут пайшоў далей за свайго рускага паплечніка: ён стварыў маштабную па задуме кнігу «Веча славянскіх балад». У творчасці ж Я. Еўтушэнкі баладны жанр не атрымаў належнага развіцця.

Творы Я. Сіпакова і Я. Еўтушэнкі ўспрымаюцца як фрагменты біяграфіі не толькі адной душы – душы паэта, амаль тоеснай ёй душы лірычнага героя, але і ўсяго беларускага і рускага народаў, нават шырэй – славянскай душы, якая знаходзіць апору ў адзінстве ўсяго чалавецтва і прыроды, Космаса. Паэтычная творчасць Я. Сіпакова і Я. Еўтушэнкі вызначаецца стылявой і жанравай разнастайнасцю, спалучае ў сабе рэалістычны і рамантычны пачаткі, поўніцца высокім патрыятычным гучаннем, схільнасцю да філасофскага роздуму.

ЛІТАРАТУРА

1. Евтушенко, Е. Стихотворения и поэмы / Е. Евтушенко. – М. : Молод. гвардия, 1990. – 190 с.
2. Сіпакоў, Я. Выбраныя творы : у 3 т. / Я. Сіпакоў. – Мінск : Маст. літ., 1995–1997. – Т. 1 : Паэзія. – 1995. – 430 с.
3. Стральцоў, М. Лінія паэтычнага гарызонта / М. Стральцоў // Полымя. – 1966. – № 5.– С. 251–257.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ